УДК 725.94(476)+94 (476)

# АРХІТЭКТУРНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСІ XI–XIII СТАГОДДЗЯЎ

*Сугака Наталля Анатольеўна, к.г.н., дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыеэлектронікі, Мінск, Беларусь*

Sugako Natalya Anatolyevna, Doctor of History, Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk, Belarus

**Анатацыя:**Даследуецца гісторыя развіцця беларускай архітэктуры XI–XIII ст. Вызначаюцца архітэктурныя школы, характкрызуецца гісторыя стварэння і развіцця культавых пабудоў на тэрыторыі Беларусі у эпоху сярэднявечча.

**Summary:** The history of development of Belarusian architecture of the XI–XIII century is researched. The schools is determined of architecture, the history of creation and development of religious buildings on the territory of Belarus in the middle ages is characterized.

**Ключавыя словы:** хрысціянства, архітэктура, Сафійскі сабор, полацкая і гродзенская школы дойлідства.

**Key words:** christianity, architecture, St. Sophia Cathedral, Polotsk and Grodno schools of architecture.

Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях істотна паўплыва на развіцце культуры і ў першую чаргу на стан архітэктуры. Да канца X ст. на Русі не было камена-цаглянага будаўніцтва. Доўгі час панавала драўляная забудова. 3 прыняццем хрысціянства бярэ пачатак узвядзенне манументальных культавых пабудоў. Важнай падзеяй стала будаўніцтва Сафійскіх сабораў у Кіеве (1017–1037), Ноўгарадзе (1045–1052), Полацку (1044–1066). Усе саборы пабудаваны па сістэмэ пяцінефнага крыжова-купальнага храма і адрозніваліся паміж сабой некаторымі элементамі: колькасцю слупоў, купалоў і апсід, прапорцыямі. Полацкі Сафійскі сабор быў пабудаваны пазней, чым Сафійскія соборы у Кіеве і Ноўгарадзе, але не саступаў ім ні памерамі, ні мастацкай выразнасцю. Гэты храм стаў сімвалам палітычнай незалежнасці Полацкага княства. У храме захоўваліся скарб, архіў, летапісы. Тут прысягалі на вернасць князю, сустракалі іншаземных паслоў, абвяшчалі вайну ці мір. Полацкі Сфійскі сабор – гэта крыжова-купальны храм з цэнтрычнай кампазцыяй, дапоўненай трыма апсідамі з усходняга боку. План забудовы уяўляе квадрат памерамі 26,4 × 26,4, з улікам апсід даўжыня храма павялічваецца да 31,5 м. Агульная колькасць апорных слупоў – 16. Храм меў сем купалоў, якія сімвалізавалі сем абрадаў “таінстваў”. Купалы хутчэй за ўсе мелі паўсферычную форму. Пакрыцце купалоў было зроблена са свінцовых лістоў. У якасці будаўнічых матэрыялаў выкарыстоўваліся плітачная цэгла і брукаваны камень. Сцены храма выкладзены ў змешанай тэхніцы, якая спалучала плінфы і прыродны камень. Выкарыстоўвалася тэхніка муроўкі з

плоскі цаглін (плінфы) на вапным растворы ружовага колеру. Таўшчыня швоў растору была роўнай таўшчыні цаглін. Такая тэхніка “са схаваным радам” стала дэкаратыўным прыемам афармлення фасадаў [6]. Сучасны выгляд Полацкай Сафіі адрозніваецца ад першапачатковага. Найбольш істотна сабор пацярпеў пад час Паўночнай вайны (1700–1721 гг.). У сярэдзіне XVIII ст. на сродкі уніяцкага мітрапаліта Ф.Грабніцкага быў узведзены храм у стылі віленскага барока. Аўтарамі праекту сталі архітэктары Я.Глаўбіц і Б.Касінскі. Стваральнікі сабора, які захаваўся да сенняшняга часу, праявілі такт і павагу да папярэдняй Сафіі. Яны захавалі рэшткі храма, а пры будаўніцтве выкарыстоўвалі аўтэнтычныя будаўнічыя матэрыялы. У нашыя часы тут размяшчаецца канцэртная зала з арганам і музей [6].

Мураванае храмавае будаўніцтва пачало актыўна развівацца ў пачатку XII ст. Фарміруюцца дзве самастойныя архітэктурныя школы: полацкая і гродзенская. Полацкая школа дойлідства сфарміравалася пад уплывам візантыйскай архітэктуры. Полацкія дойліды выкарыстоўвалі муроўку з плінфы са “схаваным радам”, калі адны рады плінфы выступалі, другія былі як бы прыхаваныя ў глыб, а прамежак паміж імі запаўняўся цамянкай – вапнавай рошчынай, у якую дабаўлялі тоўчаную цэглу. План храмаў выцягнуты па падоўжнай восі, бакавыя нефы больш вузкія, дамінуе сярэдняя апсіда. Шэраг храмаў, якія належаць да дадзенай архітэктурнай школы, мелі абходныя галерэі. Сучасныя навукоўцы вызначаюць рад забудоў, якія належаць да полацкай архітэктурнай школы. Сярод іх: Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра, царква ў гонар Параскевы Пятніцы (храм са склепам), Барысаглебская царква і Храм-трыконх Бельчыцкага манастыра, храм-пахвальня полацкіх князеў на Ніжнім замку, храм-пахвальня полацкіх епіскапаў у прадмесці Сялец, Дабравешчанская царква і храм Міхаіла Архангела у Віцебску, Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку [1, с. 155]. Цікава, што з гэтых храмаў з ацалелымі канструкцыямі да нашага часу дайшла толькі Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку.

Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр быў заснаваны князем Барысам Усяславічам на беразе Заходняй Дзвіны у прадмесці Бельчыцы. Сваю назву ен атрымаў у гонар Святых Барыса і Глеба, якія у той час шырока ушаноўваліся на усходнеславянскіх землях. Манастыр выконваў абарончыя функцыі і з’яўляўся рэзідэнцыяй князя. Навукоўцы вызначаюць у комплесе бельчыцкага Барысаглебскага манастыра чатыры мураваныя царквы: Вялікі сабор Бельчыцкага мнастыра, царква у гонар Параскевы Пятніцы (Пятніцкая царква), Барысаглебская царква і Храм-трыконх.

Вялікі сабор Бельчыцкага мнастыра датуецца 1120–1130-мі гг. Трэба адзначыць, што дакладная назва сабора невядома. У літаратуры сустракаюцца і іншыя версіі. Так, даследчык Л.В. Аляксееў называе яго Успенскім саборам. Царква была разбурана ў XVI ст. Вывучэннем дадзенага архітэктурнага помніка займаліся І.Хозераў, М.Каргер, П.Рапапорт. На аснове захаваўшыхся матэрыялаў была ажыцяўлена рэканструкцыя першапачатковага выгляду Вялікага сабора. Гэта быў крыжова-купальны 6-слуповы трохнефавы храм з трыма апсідамі. Магчыма, гэта быў галоўны храм манастыра. Ен вылучаўся

значнымі памерамі, якія складалі ў даўжыню 22,5 м, а ў шырыню – 16,5 м. План і будаўнічая тэхніка гэтай царквы мелі агульныя рысы з Сафійкім саборам: паўкруглыя апсіды, крыжападобныя апорныя слупы, тэхніка кладкі сцен "са схаваным радам". Сцены храма былі пакрыты фрэскавым роспісам. Падлога храма ўяўляла сабой пласт вапняковай замазкі з дамешкам кавалкаў цэглы.

Пятніцкая царква была узведзена ў першай трэці XII ст. Гэта невялікі бесслуповы аднанефны будынак з падземнай крыптай (склепам). Навукоўцы мяркуюць, што храм, магчыма, быў усыпальніцай фундатара Бельчыцкага Барысаглбскага манастыра князя Барыса Усяслававіча і яго нашчадкаў. У структуры храма вызначаюць высокі чацвярык, прамавугольную апсіду, вузкі прытвор. Сцены царквы былі змураваны ў тэхніцы "са схаваным радам". Падчас раскопак былі знойдзены пліткі падлогі з палівай.

Барысаглебская царква была пабудавана у сярэдзіне XII ст. і таксама належыць да комплекса Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Яна з'яўлялася трэцім значным будынкам манастырскага комплексу. Гэта аднакупальны трохнефавы крыжовакупальны храм, з 6 слупамі. Царква мела вокны, якія размяшчаліся ў два ярусы. Падлога была выкладзена керамічнымі пліткамі. Інтэр'ер быў багата аздоблены фрэскавым роспісам. Пры будаўніцтве храма выкарыстоўвалася тэхніка "са схаваным радам".

Дабравешчанская царква у Віцебску, на думку навукоўцаў, была узведзена прыкладна ў другой чвэрці XII ст. Даследчыя работы ў розныя часы праводзілі археолагі І.Хозераў, П.Бараноўскі, М.Каргер, П.Рапапорт. Пісьмовыя звесткі аб існаванні Дабравешчанскай царквы у Віцебску сустракаюцца на старонках летапісаў у XV – XVI стст. Пабудова моцна пацярпела ў гады Паўночнай войны (1700–1721 гг.). Помнік быў часткова разбураны у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1961 г. па рашэнню савецкіх ўлад Дабравешчанская царква была узарвана. У 1977 г. рэшткі храма былі закансерваваны. У 1990-я гг. была праведзена рэстаўрацыя помніка. Аўтарам праекта выступіў архітэктар Г.Лаўрэцкі. Пад час будаўнічых работ была захавана аўтэнтычная каменная кладка сцен, вышыней да некалькіх метраў. Яе можна пабачыць і з сярэдзіны і з звонку храма, таму што яна засталася не атынкаванай. Дабравешчанская царква уяўляе сабой будынак памерам 18,2 × 11,1 м. Таўшчыня сценаў дасягае ад 1,1 да 1,5 м. Падлога складаецца з невялікіх камянёў. Можна вызначыць дзве асаблівасці пабудовы гэтага храма: існаванне так званых схаваных апсід і нартэкса [1, с. 164–165].

Спаса-Праабражэнскі (Ефрасіннеўскі) манастыр быў другім значным комплексам Полацка, які быў узведзены у XII ст. У яго ансамбль уваходзіла два храмы – Спаса-Праабражэнскі сабор і безыменная царква-пахавальня. Архітэктарам Спаса-Праабражэнскай царквы і яркім прадстаўніком полацкая архітэктурнай школы быў дойлід Іаан. Навукоўцы лічаць, што яго аўтарству належаць Барысаглебскі храм, царква Святой Параскевіі Пятніцы Бельчыцкага манатыра і Спаса-Праабражэнская царква, пабудаваная па заказу Еўфрасінні Полацкай [4, с. 13].

Спаса-Праабражэнская царква Еўфрасіннеўскага манастыра знаходзіцца на беразе р. Палаты. Год пабудовы Спаскага храма дакладна невядомы.

Даследчыкі называюць розныя даты у перыяд ад 1043 г. па 1061 г. Спаса-Праабражэнская царква была пабудавана за 30 тыдняў. Тэрміны будаўнічых работ сведчаць аб прафесіяналізме архітэктараў таго часу. Спаса-Праабражэнская царква – гэта крыжова-купальны храм памерамі 9,8 х 14,4 (з апсідай 18,2 м) метраў. Сцены выкладзены з плінфы ў тэхніцы муроўкі "са схаваным радам". Бакавыя нефы невялікія і цяжар асновы барабана прыпадае на 6 слупоў. Барабан і купал храма абапіраецца на кубічны пастамент. Сабор мае адну выступную апсіду і дзве бакавыя. Тут упершыню на тэрыторыі Беларусі з'явіліся какошнікі кілепадобнай формы. Яны забяспечвалі для барабана і купала паступовы пераход да кубічнага пастамента-асновы [1, с. 173-174]. Сістэма какошнікаў выконвала і практычную функцыю, забяспечваючы адвод з дахаў вады і снегу. Царкву завяршаў барабан з выцягнутымі вокнамі і шаломападобным купалам. У заходняй часцы храма размяшчаліся келлі прападобнай Еўфрасінні і яе стрыечнай сястры Еўпраксіі. Варта адзначыць, што Спаса-Праабражэнская царква – адзіная сярод цэркваў старажытнарускага перыяду, дзе ў такой паўнаце захавалася сістэма фрэскавага жывапісу сярэдзіны XII ст. У 1990–2000-я гг. тут былі праведзены шырокія рэстаўрацыйныя працы. У 1992–2007 гг. аднаўленнем фрэсак Спаса-Праабражэнскай царквы займаўся рэстаўратар В.В. Ракіцкі, а з 2007 г. – В.Д. Сарабьянаў [5, с. 35]. Падчас работ былі адкрыты фрэскі капэлы-малельні Еўфрасінні. Сярод вобразаў фрэсак есць гіпатэтычная выява Еўфрасінні Полацкай. Жывапіс полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы сведчыць пра ўплыў візантыйскай мастацкай школы. Для фігур, намаляваных ў храме, характэрна аб'ёмнасць, значная роля адводзіцца контуру твараў. У Спаса-Праабражэнскай царкве Полацка захоўваюцца праваслаўныя святыні – мошчы святой Ефрасінні Полацкай і копія крыжа Ефрасінні Полацкай [3, с. 109].

Гродзенская архітэктурная школа была больш лакальнай і ахоплівала тэрыторыю Гародні, Ваўкавыска і Навагрудка. Да ліку помнікаў гэтай школы належаць рэлігійныя пабудовы – Ніжняя і Прачысценская цэрквы, Барысаглебская (Каложская) царква, свецкія пабудовы – княжацкія палаты і мураваныя сцены Старога замка ў Гродне. Найбольш яскравымі рысамі пабудоў гродзенскай архітэктурнай школы былі маляўнічасць афармлення фасадаў устаўкамі з каляровых шліфаваных валуноў, выкарыстанне галаснікоў у сценах, маёлікавых пліт на падлозе. Для кампазіцыі характэрна планавасць структуры, цагляная роўнарадавая муроўка, адносна невялікая таўшчыня апорных канструкцый, круглая форма ўнутраных слупоў.

Барысаглебская (Каложская) царква была пабудавана на правым беразе р. Немана на пагорку, які аддзяляецца ад Замкавай гары рэчкай Гараднічанкай, на тэрыторыі былога Каложскага пасада. Гэта цагляны 6-слуповы крыжова-купальны храм, даўжыней каля 21,5 м, шырыней – 13,5 м. Сцены, а іх таўшчыня дасягала 1,2 м, складзены з добра абпаленай плінфы ў тэхніцы роўнаслаевай муроўкі з раўнамерным чаргаваннем палос плінфы і раствора і дэкарыраваны адшліфаванымі камянямі і арнаментам у выглядзе крыжа. Памеры камянеў паступова змяншаюцца па велічыні ўгору. Гэта дазваляла павялічыць трываласць і паступова зменшыць цяжар сцен [1, с. 203]. У

верхнюю частку сцен былі замураваны гліняныя збаны-галаснікі, адкрытыя раструбамі ўнутр храма. Вышыня галаснікоў вагаецца ад 38 да 49,5 см, а дыяметр гарлавін складае 7–8 см. Збаны-галаснікі былі ўмараваны ў сцены роўнымі радамі з інтервалам у 35 см па вертыкалі і 31 см па гарызанталі. Галаснікі рабілі верхнія часткі сцен царквы больш легкімі і паляпшалі тэмпературны рэжым памяшканняў. Такі архітэктурны прыем быў вядомы і раней і выкарыстоўваўся пад час будаўніцтва ў Старажытным Рыме, Візантыі і Малой Азіі. Акрамя таго, гэта дазваляла палепшыць акусціку. Фундамент храма быў складзены з валуноў і заглыблены на 1,5 м. Падлога была пакрыта паліванымі пліткамі квадратнай, трохвугольнай і фігурнай форм зяленага, жоўтага і карычневага колеру [2, с. 11]. Сцены храма ў алтарнай часцы былі размаляваны фрэскамі. За час свайго існавання Барысаглебская царква пазнала і перабудовы і пацярпела ад прыродных стыхій. Царква знаходзіцца на беразе р. Неман, які быў размыты і у 1720 г. сцены храма нахіліліся. У 1853 г. і 1889 г. абваліліся паўднёвая і заходняя часткі сцен храма. У 1897 г. бераг ракі быў замацаваны, на месцы разбураных сцен пастаўлены драўляныя, царкву накрылі двухсхільным дахам, на якім зрабілі купал з крыжам. У такім выглядзе храм захаваўся да нашага часу.

Гродзенская Ніжняя царква была збудавана ў другой палове XII ст. і знаходзілася на тэрыторыі Гродзенскага Старога замка. Рэшткі храма выявілі навукоўцы Ю.Ядкоўскі і М.Варонін пад Гродзенскай Верхняй царквой пад час археалагічных раскопак. Сцены Ніжняй царквы захаваліся на вышыню да 4 м. Гэта быў шасціслуповы, трохнефавы аднакупальны храм. Звонку пабудова мела цэнтральную апсіду, а бакавыя ўваходзілі у асноўны аб’ём і вылучаліся ў інтэр’еры плоскімі нішамі. Сцены былі зроблены ў тэхніцы цаглянай муроўкі. У ніжняй часцы сцен былі закладзены гладка абчэсаныя звонку дэкаратыўныя каляровыя камяні розных колераў і адценняў, а вышэй знаходзіліся геаметрычныя кампазіцыі з маёлікавых плітак зялёнага і карычневага колеру. Акрамя плітак фасады будынкаў былі ўпрыгожаны плоскімі керамічнымі зялёнапаліванымі чашамі. У верхняй часцы сцен знаходзіліся збаны-галаснікі, выведзенныя адтулінамі ў сярэдзіну храма. Прысутнічалі арачныя вокны. Галоўным упрыгожваннем храма з’яўлялася падлога, выкладзенная з рознакаляровых керамічных плітак, пакрытых палівай. Тут былі выкарыстаны розныя па памерах і формах пліткі пераважна жоўтага, вішневага і зяленага колераў, якія стваралі шахматны і крыжападобны узор. Найбольш складаным быў узор цэнтральнай часткі. Ен уяўляў сабой упісаныя у квадраты кругі з крыжамі, якія абрамлялі шырокія пляценыя стужкі. Складаны дэкор і малюнак падлогі ўдалося рэканструяваць археолагу М.У. Малеўскай [2, с. 11]. Нажаль, храм быў разбураны. Прычынамі з’явіліся пажар 1183 г. і недасканалая канструкцыя фундамента.

У XIII ст. умовы для манументальнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі істотна змяніліся. У сувязі з перыядам феадальнай раздробленнасці і узмацненнем ваеннай пагрозы з боку крыжакоў і татар узнікаюць абарончыя збудаванні. У апошняй чвэрці XIII ст. у Камянцы (каля г. Брэста) была ўзведзена Белая вежа. Дадзеная абарончая пабудова была выканана па загаду

валынскага князя Уладзіміра Васількавіча. Паводле Іпацьеўскага летапісу, пабудавана паміж 1271 г. і 1289 г. Яна ўяўляе сабой мураваны “стоўп камен”. У 1903 г. па праекце архітэктара В. Суслава былі правядзены рэстаўрацыйныя работы, што змяніла выгляд архітэктурнага помніка. Рэшткі землянога вала і драўлянага замка зніклі і вакол вежы быў насыпаны і абкладзены камянямі кальцавы вал. У сярэдзіне XX ст. вежу пабялілі, а падлогу забрукавалі. Вышыня вежы – каля 30 м, таўшчыня сцен – 2,5 м, вонкавы дыяметр – 13,5 м. Складзена вежа з брусчатай цэглы цёмна-чырвонага і жаўтаватага колераў, з добрай перавяззю швоў ў тэхніцы “балтыйскай” муроўкі. Камянецкая вежа мае 5 ярусаў з байніцамі. З пятага яруса пачынаецца цагляная лесвіца-ход. У верхняй частцы вежы размяшчалася баявая пляцоўка з 14 мураванымі зубцамі. Камянец і яго вежа з’яўляліся важным стратэгічным пунктам. Навукоўцы мяркуюць, што такія абарончыя вежы былі ў Гродне, Тураве, Навагародку. Камянецкая вежа захавалася да нашых дзен і з 1960 г. тут знаходзіцца філіял краязнаўчага музея.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі ў XI–XIII стст. былі створаны ўнікальныя архітэктурныя помнікі, якія захаваліся да сённяшняга дня. Яны сведчаць пра існаванне багатай, самабытнай культуры і ўяўляюць полацкую і гарадзенскую архітэктурныя школы.

**Крыніцы і літаратура:**


1. Габрусь, Т. В. Мураваная сакральная архітэктура беларускіх земляў XI – XIII стст.: старажытнарускі перыяд / Т. В. Габрусь // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславян. і еўрап. кантэксце: у 4 т. Т. 1. IX – XIV стст. / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2005. – Гл. 2. – С. 106 – 211.
2. Здановіч Н.І., Трусаў А.А. Беларуская паліваная кераміка XI – XVIII ст. / Н.І. Здановіч. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 183 с.
3. Крест – красота церкви. Крыж – краса царквы. [Л. В. Алексеев и др.] – Мн. : Четыре четверти : Минское Епархиальное Управление Белорусской Православной Церкви, 1998. – 115 с.
4. Лабоха, Г.М. Гісторыя заснавання Бельчыцкага Барысаглебскага і Спаса-Еўрасіннеўскага манастыроў у г. Полацку / Г.М. Лабоха // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – 2008. – № 28. – С. 12–15.
5. Селицкий, А. А. Евфросиния Полоцкая. Ее храм. Ее фрески / А. А. Селицкий. – Мн. : Беларусь, 2016. – 183 с.
6. Слюнченко, В. Г. Полоцкий Софийский собор / В. Г. Слюнченко. – Мн. : Полымя, 1987. – 48 с.